ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
17.07.2025 № 118

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» ў 2025 годзе

1. Дадзенай Інструкцыяй вызначаецца парадак арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» ў 2025 годзе (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

адраджэння, развіцця, папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнага тэатральнага мастацтва, далучэння да іх шырокіх слаёў грамадства;

паказу дасягненняў у галіне тэатральнага мастацтва;

павышэння выканальніцкага майстэрства ўдзельнікаў конкурсу;

выяўлення і падтрымкі таленавітай моладзі.

3. У конкурсе могуць прымаць удзел тэатральна-відовішчныя арганізацыі Рэспублікі Беларусь, іншыя арганізацыі культуры Рэспублікі Беларусь розных формаў уласнасці, індывідуальныя прадпрымальнікі, зарэгістраванага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць творчую дзейнасць, звязаную з пастаноўкай спектакляў, установы адукацыі ў сферы культуры Рэспублікі Беларусь (далей – удзельнікі конкурсу) са спектаклямі, прэм’ера якіх у Рэспубліцы Беларусь адбылася на працягу з 1 сакавіка 2023 года па 1 чэрвеня 2025 года (далей – конкурсны перыяд).

Пры гэтым ад аднаго ўдзельніка конкурсу можа быць вылучана не больш, чым два спектаклі ў адной асноўнай намінацыі.

4. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Міністэрства культуры і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт (далей – арганізатары).

5. Для непасрэднага кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт, які фарміруецца з прадстаўнікоў арганізатараў, іншых дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый, якія прымаюць удзел у арганізацыі і правядзенні конкурсу.

Персанальны склад арганізацыйнага камітэта зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, зацвердзіўшым дадзеную Інструкцыю.

6. Арганізацыйны камітэт конкурсу:

ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем конкурсу;

зацвярджае персанальны склад адборачных камісій і журы конкурсу;

уносіць на разгляд арганізатара каштарыс выдаткаў на арганізацыю і правядзенне конкурсу, вызначае колькасць запрашальных квіткоў на правядзенне мерапрыемстваў конкурсу;

разглядае і зацвярджае праграму правядзення конкурсу, план мерапрыемстваў па арганізацыі і правядзенні конкурсу, сімволіку конкурсу, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку;

ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці, іншымі арганізацыямі па пытаннях арганізацыі і правядзення конкурсу, яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі;

вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі конкурсу;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе арганізацыі і правядзення конкурсу.

7. Для ажыццяўлення работы па арганізацыі і правядзенні конкурсу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у вызначаным заканадаўствам парадку:

вызначае арганізацыю, якая выконвае функцыі дырэкцыі конкурсу, якая:

арганізуе работу адборачных камісій і журы конкурсу;

арганізуе прагляд спектакляў, прадстаўленых удзельнікамі кункурсу, членамі адборачных камісій і журы;

распрацоўвае і рэалізуе творчую канцэпцыю правядзення конкурсу, афішу паказаў спектакляў, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, другога этапа конкурсу, сцэнарыі цырымоніі адкрыцця і закрыцця конкурсу , у тым ліку цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў;

вызначае сцэнічныя пляцоўкі для паказу спектакляў, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, фінальных мерапрыемстваў конкурсу;

забяспечвае падрыхтоўку, выданне і рэалізацыю рэкламнай, друкаванай і іншай прадукцыі;

распрацоўвае прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне конкурсу, колькасці запрашальных квіткоў на правядзенне мерапрыемстваў конкурсу;

арганізоўвае рэкламную і інфармацыйную кампанію конкурсу, працу прэс-цэнтра конкурсу;

фарміруе працоўныя службы, адміністрацыйныя групы для забеспячэння комплексу мерапрыемстваў па арганізацыі конкурсу;

забяспечвае выраб квіткоў на мерапрыемствы конкурсу, якія

праходзяць на яе пляцоўках, і выраб і распаўсюджванне запрашальных квіткоў на ўсе мерапрыемствы конкурсу;

усталёўвае парадак знаходжання ўдзельнікаў конкурсу на конкурсе;

ажыццяўляе выплату грашовай прэміі пераможцам конкурсу;

выконвае іншыя функцыі па забеспячэнні арганізацыі і правядзенні конкурсу.

8. Конкурс праводзіцца ў наступных секцыях:

«Тэатр драмы»;

«Тэатр лялек»;

«Музычны тэатр»;

«Спектакль для дзяцей і юнацтва».

9. У секцыі «Тэатр драмы» вызначаюцца дзве асноўныя намінацыі:

«Найлепшы спектакль тэатра драмы для вялікай сцэны»;

«Найлепшы спектакль тэатра драмы для малай сцэны».

Права залічэння спектакляў, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, да секцыі «Тэатр драмы», да вялікай ці малой сцэны належыць адборачнай камісіі з улікам таго, што спектаклямі для малай сцэны могуць лічыцца спектаклі, калі змяшчальнасць сцэнічнай пляцоўкі, на якой яны пастаўлены, складае не больш за 200 чалавек.

З ліку творчых работнікаў, якія задзейнічаны ў спектаклях, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, адабраных для конкурсу ў асноўных намінацыях секцыі «Тэатр драмы», вылучаюцца прэтэндэнты ў прыватных намінацыях:

«Найлепшая работа рэжысёра ў спектаклі тэатра драмы»;

«Найлепшая работа мастака ў спектаклі тэатра драмы»;

«Найлепшая жаночая роля ў спектаклі тэатра драмы»;

«Найлепшая мужчынская роля ў спектаклі тэатра драмы»;

«Найлепшая работа драматурга ў спектаклі тэатра драмы»;

«Прэмія журы».

Лаўрэаты ў прыватнай намінацыі «Найлепшая работа драматурга ў спектаклі тэатра драмы» вызначаюцца з ліку аўтараў спектакляў, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, якія створаны паводле арыгінальных драматычных твораў беларускіх аўтараў не пазней за 15 гадоў да даты абвяшчэння конкурсу.

Лаўрэаты ў прыватнай намінацыі «Прэмія журы» вызначаюцца журы конкурсу з ліку спектакляў або творчых калектываў спектакляў, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, адабраных для конкурсу ў асноўных намінацыях секцыі «Тэатр драмы».

10. У секцыі «Тэатр лялек» вызначаецца адна асноўная намінацыя «Найлепшы спектакль тэатра лялек».

З ліку творчых работнікаў, якія задзейнічаны ў спектаклях,

прадстаўленных удзельнікамі конкурсу і адабраных для конкурсу ў асноўнай намінацыі секцыі «Тэатр лялек», вызначаюцца лаўрэаты ў прыватных намінацыях:

«Найлепшая работа рэжысёра ў спектаклі тэатра лялек»;

«Найлепшая работа мастака ў спектаклі тэатра лялек»;

«Найлепшая акцёрская работа ў спектаклі тэатра лялек»;

«Прэмія журы».

Лаўрэаты ў прыватнай намінацыі «Прэмія журы» вызначаюцца журы конкурсу з ліку спектакляў ці творчых работнікаў, якія задзейнічаны ў спектаклях, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, адабраных для конкурсу ў асноўнай намінацыі секцыі «Тэатр лялек».

11. У секцыі «Музычны тэатр» вызначаюцца тры асноўныя намінацыі:

«Найлепшы оперны спектакль»;

«Найлепшы спектакль балета»;

«Найлепшы спектакль у жанры аперэта, музычная камедыя, мюзікл».

З ліку творчых работнікаў, якія задзейнічаны ў спектаклях, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, адабраных для конкурсу ў асноўных намінацыях секцыі «Музычны тэатр», вызначаюцца ў прыватных намінацыях:

«Найлепшая работа пастаноўшчыка ў музычным спектаклі» (рэжысёра або балетмайстра, або харэографа);

«Найлепшая работа мастака ў музычным спектаклі»;

«Найлепшая жаночая роля ў музычным спектаклі»;

«Найлепшая мужчынская роля ў музычным спектаклі»;

«Найлепшая работа дырыжора ў музычным спектаклі»;

«Прэмія журы».

Лаўрэаты ў прыватнай намінацыі «Прэмія журы» вызначаюцца журы конкурсу з ліку спектакляў ці творчых работнікаў, якія задзейнічаны ў спектаклях, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, адабраных для конкурсу ў асноўных намінацыях секцыі «Музычны тэатр».

У асноўнай намінацыі «Найлепшы спектакль у жанры аперэта, музычная камедыя, мюзікл» не могуць быць вылучаны спектаклі-мюзіклы, пастаўленыя па ліцэнзіі, якая не дазваляе беларускаму творчаму калектыву ўносіць змены ў пастаноўку.

12. У секцыі «Спектакль для дзяцей і юнацтва» вызначаецца адна асноўная намінацыя «Найлепшы спектакль для дзяцей і юнацтва» ў якой могуць вылучацца спектаклі, якія створаны тэатрам драмы, лялек, оперы, балета, музычным тэатрам.

Пры гэтым спектаклі могуць быць вылучаны на конкурс адначасова ў секцыях «Тэатр драмы», «Тэатр лялек», «Музычны тэатр»

і «Спектакль для дзяцей і юнацтва».

13. У рамках конкурсу таксама прысуджаюцца спецыяльныя прэміі:

«За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі»;

«За падтрымку тэатральнага мастацтва Беларусі».

На суісканне спецыяльнай прэміі «За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі» могуць вылучацца творчыя работнікі Рэспублікі Беларусь, якія працуюць ў галіне тэатральнага мастацтва не менш за 10 гадоў і маюць значныя асабістыя творчыя заслугі, якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне.

На суісканне спецыяльнай прэміі «За падтрымку тэатральнага мастацтва Беларусі» могуць вылучацца юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія на працягу конкурснага перыяду аказвалі бязвыплатную (спонсарскую) дапамогу арганізацыям культуры, установам адукацыі ў сферы культуры Рэспублікі Беларусь на мэты, звязаныя з развіццём тэатральнага мастатцва.

Фізічныя асобы могуць вылучацца на суісканне спецыяльнай прэміі «За падтрымку тэатральнага мастацтва Беларусі» пры умове аказання імі на працягу конкурснага перыяду ахвяраванняў арганізацыям культуры, здзяйсняючым культурную дзейнасць ў галіне тэатральнага мастацтва.

Вылучэнне суіскальнікаў спецыяльных прэмій у намінацыях «За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі» і «За падтрымку тэатральнага мастацтва Беларусі» могуць ажыццяўляць:

дзяржаўныя тэатры;

іншыя арганізацыі культуры, якія займаюцца прафесійнай творчай дзейнасцю ў галіне тэатра;

установы адукацыі ў сферы культуры;

грамадскія аб'яднанні «Беларускі саюз тэатральных дзеячаў», «Беларускі саюз кінематаграфістаў»;

арганізатары, дзяржаўныя установы, якія выконваюць функцыі дырэкцыі міжнародных і рэспубліканскіх тэатральных фестываляў, якія праводзіліся ў Рэспубліцы Беларусь на працягу конкурснага перыяду.

14. Рашэнне аб прысуджэнні спецыяльных прэмій прымае арганізацыйны камітэт конкурсу шляхам адкрытага або таемнага галасавання простай большасцю галасоў членаў а арганізацыйнага камітэта, якія прысутнічалі на яго пасяджэнні. Спосаб галасавання вызначаецца на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня арганізацыйнага камітэта. Рашэнне арганізацыйнага камітэта афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня арганізацыйнага камітэта, а ў выпадку яго адсутнасці на пасяджэнні, – асоба, якая выконвала яго абавязкі.

Рашэнне арганізацыйнага камітэта з’яўляецца канчатковым.

15. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў газеце «Культура», іншых сродках масавай інфармацыі, на афіцыйных сайтах арганізатараў у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт і павінна ўтрымліваць звесткі аб месцы і тэрмінах правядзення конкурсу, умовах конкурсу, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленых спектакляў, парадку і тэрмінах аб’яўлення вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі, прадугледжаныя грамадскім заканадаўствам.

16. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі спектакля з’яўляюцца:

высокі мастацкі ўзровень;

наяўнасць арыгінальных творчых ідэй, якія садзейнічаюць развіццю нацыянальнага тэатральнага мастацтва.

17. Конкурс праводзіцца ў два этапы:

першы этап з’яўляецца адборачным і праходзіць у перыяд з 18 ліпеня 2025 г. па 1 кастрычніка 2025 г.;

на другім этапе падводзяцца вынікі конкурсу і вызначаюцца яго пераможцы.

Другі этап конкурсу праводзіцца ў тэрміны, вызначаныя арганізацыйным камітэтам, не пазней снежня 2025 года.

18. На першым этапе згодна з вынікамі разгляду заявак удзельнікаў конкурсу вылучаюцца спектаклі для ўдзелу ў другім этапе конкурсу.

Для вылучэння спектакляў для ўдзелу ў другім этапе конкурсу фарміруюцца адборачныя камісіі па секцыях «Тэатр драмы», «Тэатр лялек», «Музычны тэатр» і «Спектакль для дзяцей і юнацтва» з ліку творчых работнікаў, мастацтвазнаўцаў, тэатральных крытыкаў, прадстаўнікоў арганізатараў і іншых зацікаўленых арганізацый з улікам прапаноў тэатраў, устаноў адукацыі ў сферы культуры, творчых саюзаў і іншых зацікаўленых арганізацый у колькасці да пяці чалавек кожная, а таксама супрацоўнік Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, які выконвае функцыі сакратара адборачнай камісіі.

У склад адборачных камісій не могуць уваходзіць творчыя работнікі, якія ўдзельнічалі ў стварэнні і (або) выкананні спектакляў, вылучаных для ўдзелу ў конкурсе, прадстаўнікі ўдзельнікаў конкурсу.

За працу ў складзе адборачных камісій членам адборачных камісій выплочваецца ўзнагароджанне ў памеры, вызначаным Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, за выключэннем асоб, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі служачымі.

Склад адборачнай камісіі зацвярджаецца загадам Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

19. Члены адборачнай камісіі павінны:

ажыццяўляць папярэдні прагляд відэазапісаў спектакляў, вылучаных

на конкурс;

выязджаць, пры неабходнасці, на прагляды спектакляў, якія прайшлі папярэдні адбор па відэазапісах;

удзельнічаць у пасяджэннях адборачнай камісіі і галасаванні;

не даводзіць да агульнага ведама і не паведамляць асобам, якія не з’яўляюцца членамі адборачнай камісіі, інфармацыю аб ходзе абмеркавання і галасавання па вылучэнні спектакляў на другі этап конкурсу, а таксама не распаўсюджваць інфармацыю, якая можа нанесці шкоду рэпутацыі ўдзельнікаў і арганізатараў конкурсу;

згодна з рашэннем арганізацыйнага камітэта прымаць удзел у прэс-канферэнцыях, рэкламных мерапрыемствах, звязаных з правядзеннем конкурсу.

20. Адборачныя камісіі па выніках папярэдняга адбору спектакляў на падставе відэазапісаў і, пры неабходнасці, прагляду спектакляў, якія прайшлі папярэдні адбор, непасрэдна на сцэнічных пляцоўках, у тэрмін не пазней 1 кастрычніка 2025 г. прымаюць рашэнне аб вылучэнні спектакляў (не менш за два спектаклі на кожную асноўную намінацыю) для ўдзелу ў другім этапе конкурсу.

Кіраўнікі арганізацый, спектаклі якіх заяўлены для ўдзелу ў першым этапе конкурсу, забяспечваюць умовы для прагляду спектакляў адборачнымі камісіямі.

Адборачныя камісіі па выніках папярэдняга адбору спектакляў маюць права прымаць рашэнне аб выключэнні намінацыі ці конкурснай праграмы з другога этапа конкурсу пры адсутнасці конкурсу – калі падана менш за два спектаклі на кожную асноўную для ўдзелу намінацыі.

21. Рашэнні адборачных камісій прымаюцца шляхам галасавання простай большасцю галасоў. Рашэнні лічацца правамоцнымі, калі на пасяджэннях адборачных камісій прысутнічала не менш за дзве трэці іх агульнага складу. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласавалі старшыні адборачных камісій.

Рашэнні адборачных камісій афармляюцца пратаколамі, якія падпісваюцца старшынямі адборачных камісій і іх сакратарамі.

Рашэнні адборачных камісій лічыцца канчатковымі.

22. Спісы спектакляў, якія вылучаны для ўдзелу ў другім этапе конкурсу, публікуюцца ў газеце «Культура», іншых сродках масавай інфармацыі, на афіцыйных сайтах арганізатараў у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт не пазней за пяць дзён пасля афармлення пратаколаў пасяджэнняў адборачных камісій.

23. У рамках другога этапа конкурсу праводзяцца паказы спектакляў, а таксама могуць праводзіцца навукова-практычныя канферэнцыі і іншыя культурныя мерапрыемствы, канкрэтны пералік якіх прадугледжваецца ў

праграме правядзення конкурсу.

24. Паказы спектакляў на другім этапе конкурсу:

на пляцоўцы дырэкцыі ажыццяўляюцца паказы спектакляў тэатраў з рэгіёнаў пры ўмове рэалізацыі квіткоў дырэкцыяй;

на асабістых сцэнічных пляцоўках з самастойнай рэалізацыяй квіткоў ажыццяўляюцца паказы спектакляў тэатраў з г.Мінска пры ўзгадненні з дырэкцыяй конкурсу.

25. Па прапанове дырэкцыі пры ўзгадненні арганізацыйным камітэтам, удзельнікі другога этапа конкурсу з рэгіёнаў, а таксама журы конкурсу і тэатральныя крытыкі, могуць забяспечвацца харчаваннем і (або) пражываннем на тэрыторыі г.Мінска, аплатай выдаткаў па праезду творчай трупы і дастаўцы дэкарацый да г.Мінска і назад за кошт арганізатараў.

26. Для падвядзення вынікаў конкурсу і вызначэння яго пераможцаў фарміруюцца журы конкурсу па секцыях «Тэатр драмы», «Тэатр лялек», «Музычны тэатр», «Спектакль для дзяцей і юнацтва» (далей – журы).

Склад журы конкурсу фарміруецца з ліку творчых работнікаў, тэатральных крытыкаў, мастацтвазнаўцаў, іншых работнікаў культуры, дзеячаў культуры і мастацтва, прадстаўнікоў арганізатараў і іншых зацікаўленых арганізацый з улікам прапаноў тэатраў, устаноў адукацыі ў сферы культуры, творчых саюзаў і іншых зацікаўленых арганізацый у колькасці пяці чалавек, а таксама супрацоўніка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, які выконвае функцыі сакратара журы.

У склад журы конкурсу не могуць уваходзіць творчыя работнікі, якія ўдзельнічалі ў стварэнні і (або) выкананні спектакляў, вылучаных для ўдзелу ў конкурсе, прадстаўнікі ўдзельнікаў конкурсу.

За працу ў складзе журы конкусу членам журы, за выключэннем асоб, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі служачымі, выплочваецца ўзнагароджанне ў памеры, вызначаным Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

27. Член журы конкурсу абавязаны:

прысутнічаць на праглядах спектакляў, прадстаўленых удзельнікамі конкурсу, адабраных на другі этап конкурсу;

удзельнічаць у пасяджэннях журы і галасаванні;

не даводзіць да агульнага ведама і не паведамляць асобам, якія не з’яўляюцца членамі журы, інфармацыю аб ходзе абмеркавання і галасавання па вызначэнні пераможцаў конкурсу, а таксама не распаўсюджваць інфармацыю, якая можа нанесці шкоду рэпутацыі ўдзельнікаў і арганізатараў конкурсу;

па рашэнні арганізацыйнага камітэта прымаць удзел у прэс-канферэнцыях, рэкламных мерапрыемствах, звязаных з правядзеннем конкурсу.

28. Журы конкурсу праглядаюць вылучаныя адборачнымі камісіямі для ўдзелу ў другім этапе конкурсу тэатральныя пастаноўкі на тэатральных пляцоўках горада Мінска ў перыяд, вызначаны арганізацыйным камітэтам, абмяркоўваюць іх і прымаюць рашэнне аб пераможцах у намінацыях конкурсу.

У кожнай намінацыі вызначаецца не больш за аднаго пераможца.

Журы конкурсу маюць права не вызначаць пераможцаў у асобных намінацыях конкурсу.

29. Рашэнні журы конкурсу прымаюцца шляхам таемнага галасавання простай большасцю галасоў. Рашэнні журы лічацца правамоцнымі, калі на пасяджэннях прысутнічала не менш за дзве трэці іх агульнага складу. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня журы.

Рашэнні журы конкурсу афармляюцца пратаколамі, якія падпісваюцца старшынямі і сакратарамі журы і агучваюцца на ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў.

Рашэнне журы конкурсу лічыцца канчатковым.

30. Вынікі конкурсу абвяшчаюцца на ўрачыстай цырымоніі, якая праводзіцца ў тэрміны, вызначаныя арганізацыйным камітэтам, дзе пераможцы атрымліваюць прызы, дыпломы лаўрэата.

31. Тэатрам, іншым арганізацыям культуры, установам адукацыі ў сферы культуры, спектаклі якіх сталі пераможцамі ў асноўных намінацыях конкурсу, вызначаецца грашовая прэмія ў памеры 250 базавых велічынь у кожнай намінацыі. Памер базавай велічыні вызначаецца на дзень выплаты прэміі.

32. Творчым работнікам, якія сталі пераможцамі ў прыватных намінацыях, вызначаецца грашовая прэмія ў памеры 100 базавых велічынь у кожнай намінацыі. Памер базавай велічыні вызначаецца на дзень выплаты прэміі.

33. Тэатрам, іншым арганізацыям культуры, установам адукацыі ў сферы культуры, творчым работнікам, якія сталі пераможцамі ў прыватнай намінацыі «Прэмія журы», вызначаецца грашовая прэмія ў памеры 100 базавых велічынь. Памер базавай велічыні вызначаецца на дзень выплаты прэміі.

34. Творчым работнікам, якія сталі лаўрэтамі спецыяльнай прэміі «За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі», вызначаецца грашовая прэмія ў памеры 100 базавых велічынь. Памер базавай велічыні вызначаецца на дзень выплаты прэміі.

35. Юрыдычным або фізічным асобам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам, якія сталі лаўрэатамі спецыяльнай прэміі «За падтрымку тэатральнага мастацтва Беларусі», грашовая прэмія

не вызначаецца.

36. Грашовая прэмія пералічваецца на разліковы рахунак удзельнікаў конкурсу, якія сталі пераможцамі, або творчыя работнікі якіх сталі пераможцамі.

37. Юрыдычныя і фізічныя асобы маюць права ўручаць спецыяльныя прызы, іншыя ўзнагароды ўдзельнікам другога этапу конкурсу, па ўзгадненні з арганізацыйным камітэтам.

38. Для ўдзелу ў конкурсе ўдзельнікі конкурсу прадстаўляюць на электронны адрас Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (ministerstvo@kultura.gov.by) у перыяд з 18 ліпеня 2025 г. па 18 жніўня 2025 г. наступныя матэрыялы:

заяўка на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам да дадзенай Інструкцыі;

праграма спектакля з указаннем даты прэм'еры;

звесткі аб рэжысёрска-пастановачнай групе;

сінопсіс спектакля;

відэазапіс спектакля (дзеючую спасылку ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт);

афіша, фатаграфіі спектакля;

інфармацыя і водгукі пра спектакль у сродках масавай інфармацыі;

падрабязныя характарыстыкі дэкарацый, пералік неабходнага тэхнічнага і музычнага абсталявання (тэхнічны райдар).

39. Для ўдзелу ў конкурсе на суісканне спецыяльных прэмій з 18 ліпеня 2025 г. па 18 жніўня 2025 г. на электронны адрас Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (ministerstvo@kultura.gov.by) падаюцца наступныя матэрыялы:

ліст-прадстаўленне з характарыстыкай і ўказаннем канкрэтных заслуг суіскальніка спецыяльнай прэміі;

выпіска з пратакола пасяджэння калегіяльнага органа арганізацыі культуры, установы адукацыі ў сферы культуры, грамадскага аб'яднання, арганізатара, дырэкцыі, арганізацыйнага камітэту міжнароднага ці рэспубліканскага тэатральнага фестывалю, пры іх адсутнасці – агульнага сходу работнікаў арганізацыі;

копіі або электронныя спасылкі на публікацыі (відэа-, радыёсюжэты) у сродках масавай інфармацыі, звесткі аб дзяржаўных і (або) ведамасных узнагародах, прэміях, прызах, дыпломах лаўрэатаў, іншых узнагародах, лісты падзяк і да гэтага падобныя звесткі, якія сведчаць аб грамадскім прызнанні заслуг.

40. Матэрыялы, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, вызначаных пунктамі 38 і 39 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

41. Фінансаванне выдаткаў на арганізацыю і правядзенне конкурсу, цырымоніі адкрыцця закрыцця конкурсу, у тым ліку цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў, ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, прадугледжаных на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021–2025 гады (падпраграма 2 «Мастацтва і творчасць», глава 7), зацверджанай постановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 студзеня 2021 г. № 53, дахода ад рэалізацыі квіткоў, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» у 2025 годзе

# ЗАЯЎКА
на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» у 2025 годзе

Звесткі аб удзельніку конкурсу: ______________________________
(тэатральна-відовішчныя арганізацыі
______________________________
Рэспублікі Беларусь, іншай арганізацыі культуры Рэспублікі Беларусь, установы
______________________________
адукацыі ў сферы культуры Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці са статутным
______________________________
дакументам на беларускай і рускай мовах; прозвішча, уласнае імя,
______________________________
імя па бацьку (пры яго наяўнасці) індывідуальнага прадпрымальніка,
______________________________
зарэгістраванага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь)

Назва спектакля: ______________________________
______________________________
Год стварэння, дата прэм'еры: ______________________________
Намінацыя (-цыі), у якой (якіх) вылучаецца: ______________________________
______________________________

Звесткі аб рэжысёрска-пастановачнай групе (для кожнага запаўняецца пасада з назвай установы, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (пры наяўнасці), дата нараджэння):
аўтар п'есы (інсцэніроўкі, лібрэта)______________________________
кампазітар (аўтар музычнага афармлення) ______________________________
рэжысёр-пастаноўшчык ______________________________
балетмайстар-пастаноўшчык ______________________________
мастак-пастаноўшчык ______________________________
мастак па касцюмах ______________________________
дырыжор-пастаноўшчык ______________________________
хормайстар-пастаноўшчык______________________________
мастак па святлу ______________________________
выканаўцы галоўных роляў:______________________________
______________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

Кароткая інфармацыя аб спектаклe (жанр, анатацыя, за што вылучаецца на конкурс): ________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

Пералік прыкладзеных да заяўкі матэрыялаў з водгукамі ў прэсе на спектакль (назва, дата друку (выхаду ў эфір), нумар выдання і г.д.)

________________________________________________________________

________________________________________________________________

Інфармацыя аб колькасці носьбітаў запісу спектаклю ў электронным выглядзе: ____________________________________________

________________________________________________________________

Звесткі асобы, якая ажыццяўляе падачу конкурсных матэрыялаў для ўдзелу ў конкурсе __________________________________________________

(пасада, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (пры наяўнасці),

________________________________________________________________

адрас, мабільны тэлефон, электронны адрас)

__ _____________ 20____г. _______________ ___________________

(дата) (подпіс) (прозвішча, ініцыялы)